ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення
адукацыі  Карэліцкага
райвыканкама, старшыня
арганізацыйнага камітэту
___________ І.В.Асташэвіч
“    “ кастрычніка 2020 г.

**Заданні школьнага этапу рэспубліканскай алімпіяды**
**па беларускай мове і літаратуры 2020/2021 навучальны год**
**Комплексная работа**

**10 клас**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | | | | | | | | | | | |

1. **Устаўце, дзе гэта неабходна, прапушчаныя літары. Растлумачце лексічнае значэнне падкрэсленых слоў.**

Ра..чыніць цеста, бл..ха, в..лікарослы, л..нолеум, нор..-ост, міласэр..ны, спар..мен, ра..танне, арх..олаг, альма-мат..р, в..лікадушны, дз..як, мадз..яр, лан..шафт, Пал..сціна, п..нтхаус.

Норд-ост –

Пентхаус –

**2. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову. Ва ўсіх словах кожнага выразу пастаўце націск.**

| У рускай мове | У беларускай мове |
|---|---|
| 1.Снизу доверху | |
| 2.Замкнутая на ключ дверь | |
| 3.Красивая застёжка | |
| 4.Гравийный участок | |
| 5.Не успел даже икнуть | |
| 6.Вымыть дочиста | |
| 7.Береги честь смолоду | |
| 8.Городская набережная | |

**3. Са слоў, прапанаваных у дужках, выберыце адпаведную для зместу сказа іншамоўную адзінку. Запішыце гэтую лексему ў пачатковай форме і растлумачце яе значэнне.**

1. У вёсках многія суседзі ўстанавілі (*бройлеры, бойлеры*).
2. Хлопцы і дзяўчаты арганізавалі на плошчы ўжо дзясятак (*флэшмобаў, кэшбэкаў*).
3. Новае абсталяванне дапамагае (*клінерам, клірынгам*) хутчэй і лепш працаваць.
4. У Валодзькі ўзнікла думка зняць нават не (*раму, рымарства, рымейк*), а (*сікамор, сіквел*).
5. Перамога нашай хакейнай дружыны была па (*балах, булітах, бітах*).

**4. Устаўце ў сказы прапушчаныя фразеалагізмы з кампанентамі-прыметнікамі, што з'яўляюцца назвамі колераў, у адпаведнасці з пазначанымі лексічнымі значэннямі.**

| Сказ | Значэнне фразеалагізма |
|---|---|
| 1.Самыя прыдзірлівыя рэдактары, літаратурныя сакратары, стылісты артыкулам Юрыя давалі ______________________ (У. Мяжэвіч). | "Свабодны шлях, без перашкод і затрымак" |
| 2. Каб не выглядаць за гэтым сталом ______________________, правінцыялкаю, што трапіла ў вышэйшы выглядам" свет ды не ўмее сябе трымаць у гэтым свеце, і Валянціна пацягнулася да закускі…(Л. Арабей). | "Чалавек, рэзка непадобны да іншых людзей сваімі паводзінамі ці знешнім выглядам" |
| 3. Тая раскіданасц бессістэмнасць, што пануе ў прадмове, ______________________ праходзіць праз увесь зборнік, праз усе яго артыкулы (С. Палуян). | "Вельмі выразна, ярка" |

**5. Якой лексіка-граматычнай функцыяй аб'яднаны словы? Дайце ім граматычную характарыстыку. Патлумачце значэнне.**

*Бэж, індыга, марэнга, масака, хакі.*

**6. Вызначце, як утварыліся прыдаткі да назваў свят і прысвяткаў беларускага народнага календара.**

| **Назва** | **Утваральная аснова** | **Спосаб словаўтварэння** |
|---|---|---|
| ***Узор: 24.04– Анціп-ахоўнік*** | ***ахоўва(ць)+ нік ([] )*** | ***суфіксальны*** |
| 6.02 – Аксіння-паўзіміца | | |
| 17.03– Герасім-гракоўнік | | |
| 14.07 – Кузьма-сякач | | |
| 14.09–Сямён-летаправодзец | | |
| 9.10 – Іван-кураед | | |

**7. Вызначце, якой часцінай мовы і якім членам сказа з'яўляюцца выдзеленыя словы.**

1. Плачу даніну дзіўнай здрадзе, што між пялёсткамі лілеі, прыдатная чужой уладзе, быць ***пэўнай*** (_________________) пэўны час умее (М. Стральцоў).
2. На санным следзе загалосіць полаз. І жнеек на жніво запросіць Колас. І крывічам пра іхні род усім напомніць Богам ***дадзены*** (_________________) Максім (Р. Барадулін).
3. – Юшка, брат, будзе ***першы*** (_________________) гатунак. Нават Трыфанавіч будзе задаволены (У. Караткевіч).
4. …Ды зноў ніводзін інстытут Панаса не прыняў. І, што вы думаеце, хлопец здаўся? Ды не! Ён ***цэлы*** (________________-) год яшчэ чакаў, а потым зноў прыёму дабіваўся. (у. Корбан).
5. Кожны будаўнік – у ***пэўнай*** (_________________) ступені паэт і летуценнік, з вялікаю вераю ў свае сілы і магчымасці (С. Грахоўскі).

**8. Запоўніце табліцу.**

| **Герой (героі)** | **Назва твора** | **Жанр твора** | **Аўтар** |
|---|---|---|---|
| **Кручкоў, Пратасавіцкі, Грышка, Цюхай-Ліпскі** | | | |
| **Пятрок і Сцепаніда Багацькі** | | | |
| **Алесь Загорскі, Кроер, сям'я Кагутоў, Кастусь Каліноўскі** | | | |
| **Ганна, Антось, Міхал, Костусь** | | | |
| **Данілка, Зоська, Лявон і Марыля Зяблікі** | | | |

**9. Суаднясіце кожны літаратуразнаўчы тэрмін з адпаведным яму азначэннем. Запішыце тэрмін, назва якога адсутнічае ў левай калонцы.**

| Літаратуразнаўчы тэрмін | Азначэнне літаратуразнаўчага тэрміна |
|---|---|
| **1.** Адухаўленне | **А.** Замена аднаго слова ці выразу іншым на аснове знешняй ці ўнутранай сувязі паміж з’явамі. |
| 2.Сімвал | **Б.** Супастаўленне дзвюх з’яў з мэтай іх характарыстыкі адной праз другую. |
| 3. Метанімія | **В**. Слова, радок ці некалькі радкоў, якія паўтараюцца пасля кожнай страфы. |
| 4.Параўнанне | **Г.** Умоўнае абазначэнне з’явы праз прадмет, які нечым нагадвае, намякае на яе. |
| 5. ? | **Д.** Адзін з відаў метафары, прыпадабненне нежывога прадмета жывой істоце, чалавеку. |

**10.Па ўрыўках з твора назавіце аўтара і яго твор.**

| Урывак | Твор | Аўтар |
|---|---|---|
| 1. Строга й сурова караў звычкі дурныя людзей.<br>Ён справядлівасць любіў, шанаваў яе нормы святыя,<br>Не дазваляў, каб махляр дзесьці абходзіў закон. | | |
| 2. А хлопцы нават паўставалі,<br>У чыгунчык вочы паўстаўлялі,<br>Глядзяць, не моргнуць яны вокам:<br>Эх, мусіць, смачны клёцкі з сокам! | | |
| 3. Смешна было глядзець, як маці бярэ з агульнай кучы кавалак, варочае яго з боку на бок, перакладае з рукі на руку, гадаючы,<br>каму пакласці, а сёстры і Коля ўважліва сочаць за матчынымі рукамі, маўчаць, ані слова. | | |